# *§ 12–0. Вялікая славянская міграцыя і Беларусь

**1. Прарадзіма славян.** У гістарычнай навуцы існуюць розныя пункты погляду на прарадзіму славян. Большасць расійскіх даследчыкаў лічаць, што яна знаходзілася на поўнач ад Карпат. Між тым польскія гісторыкі-аўтахтаністы адстойваюць міжрэчча Одэра і Віслы, іншыя вучоныя называюць у якасці «старажытнай калыскі» славян Сярэдняе Падняпроўе. Прыводзяцца таксама сур’ёзныя аргументы на карысць дунайскай лакалізацыі славян (на поўдзень ад Карпат).




## ГІПОТЭЗЫ АБ ПРАРАДЗІМЕ СЛАВЯН

1. Вісла-Одэрская (тэрыторыя сучаснай Польшчы).
2. Сярэднедняпроўская (тэрыторыя паўночна-заходняй Украіны, паўднёвай Беларусі і паўднёва-ўсходніх абласцей Польшчы).
3. Дунайская — Сярэдні Дунай (тэрыторыя сучаснай Венгрыі) і інш.

*Прарадзіма славян*

1. Назавіце вучоных — прыхільнікаў пералічаных гіпотэз.
2. Скарыстаўшыся дадатковымі крыніцамі інфармацыі, пашырце пералік гіпотэз наконт прарадзімы славян.
3. Сярод беларускіх вучоных найбольш актуальнай апошнім часам з'яўляецца палеская гіпотэза. Раскрыйце яе сутнасць. Якія археалагічныя знаходкі пацвярджаюць права на існаванне дадзенай гіпотэзы?